# ЦАНА ПЫТАННЯ — 64 КАПЕЙКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— Мы аказваем паслугі, якія раздзяляюцца на асноўныя і дадатковыя. Асноўныя — гэта вываз цвёрдых бытавых адходаў ад насельніцтва, — растлумачыла **начальнік аддзела юрыдычнай і кадравай работы ўнітарнага прадпрыемства «Нясвіжская камунальная гаспадарка» Наталля ДРАЧЭНКА**. — Забіраем іх, вывозім, сартуем на адпаведных пунктах, а тое, што непрыгоднае, утылізуем на палігонах. Канешне, мы нясём матэрыяльныя затраты, таму дзяржава выдзяляе нам датацыі. У мадэрнізацыю ўкладваем і свае сродкі. Паколькі вываз цвёрдых бытавых адходаў, паўтаруся, асноўная паслуга, то мы абавязаны яе аказваць усяму раёну. Для гэтага распрацаваны графікі аб'езду падворкаў спецыяльнымі машынамі. Аўтамабіль спыняецца каля кожнага жылога дома, і грузчык забірае адходы, якія жыхары ставяць у пакетах за вароты. Гэта па тых вёсках, дзе няма абсталяваных кантэйнерных пляцовак. Яны ўстаноўлены толькі ў Нясвіжы, гарадскім пасёлку Гарадзея, а таксама ў некаторых аграгарадках каля шматкватэрных жылых дамоў. У Вялікай Быхаўшчыне, дзе пражывае Вольга Канстанцінаўна, смецце вывозіцца ў другую і чацвёртую сераду кожнага месяца. Ніякіх нараканняў ад жыхароў няма.

**— Наталля Васілеўна, і ўсё ж колькі каштуе для жыхароў вываз цвёрдых бытавых адходаў? Магчыма, для Вольгі Канстанцінаўны як пенсіянеркі, інваліда гэта непад'ёмная сума?**

— На аднаго зарэгістраванага ў доме за вываз адходаў налічваецца 1 рубель 29 капеек штомесяц. Паколькі Вольга Канстанцінаўна інвалід, на яе распаўсюджваецца 50-працэнтная льгота. Атрымліваецца, што цана спрэчкі — 64 капейкі. Гэтыя тарыфы ўзятыя не з неба: яны разлічаны і зацверджаны Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**— Жанчына сцвярджае, што ў яе наогул вельмі мала смецця збіраецца. І яна яго спальвае...**

— У любым выпадку смецце ёсць. Ды і па экалагічных нормах, а таксама правілах пажарнай бяспекі спальваць яго нельга — так нядоўга і да бяды. Акрамя таго, паслугу па вывазе смецця, як асноўную, можа аказваць і без дагавора. Але мы імкнёмся, каб у нас з грамадзянамі былі дагаворныя абавязацельствы. Тым, хто адмаўляецца ісці на гэта, мы адрасуем пісьмы, тлумачым сутнасць справы, папярэджваем. І толькі пасля патрабуем аформіць усё належным чынам.

**— А калі чалавек усё роўна ўпарта стаіць на сваім, адмаўляецца?**

— У такім выпадку звяртаемся ў суд. Што датычыцца Вольгі Канстанцінаўны, то суд пайшоў ёй насустрач. Паколькі яна інвалід, то суддзя, сакратар, прадстаўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі правялі пасяджэнне па месцы жыхарства жанчыны ў вёсцы Вялікая Быхаўшчына. Суддзя папярэдне правёў з ёй гутарку.

Напачатку Вольга Канстанцінаўна пагадзілася заключыць дамову ў тым выпадку, калі каля яе дома абсталююць кантэйнерную пляцоўку. Але гэта затратна, яе трэба забетанаваць, устанавіць ёмістасць, захаваць усе санітарныя нормы. Разам з тым у такім выпадку для вывазу бытавых адходаў неабходны спецыяльны кантэйнеравоз з баковай загрузкай, што цягне за сабой дадатковыя затраты... Чалавек можа і самастойна набыць кантэйнер або ўзяць яго ў арэнду ў спецыялізаваных арганізацый. У прынцыпе і мы маем магчымасць яго прадаставіць. Адходы ў гэтым выпадку забіраем раз у месяц, але каштаваць такая паслуга будзе значна больш, чым падворны вываз! Акрамя таго, ёсць інструкцыя па арганізацыі раздзельнага збору, захаванні і перапрацоўцы камунальных адходаў, дзе канкрэтна прапісана, што кожны ўласнік можа абсталяваць спецыяльна адведзенае месца для складзіравання смецця на сваім зямельным участку. Яно вывозіцца прыкладна раз у паўгода, калі яма цалкам запоўніцца.

Усё гэта мы растлумачылі Вользе Канстанцінаўне, і яна ў добраахвотным парадку заключыла з намі дагавор. Мы адмовіліся ад іску ў адносінах да яе і заключылі міравую. Калі б суд прыняў рашэнне на нашу карысць, то ёй давялося б аплаціць дзяржпошліну ў памеры 63 рублі.



**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

СТАЛІЧНЫЯ НАВІНЫ

## Індыкатар задаволенасці

### *У Мінску правядуць апытанне аб якасці паслуг ЖКГ*

**Зараз зацвярджаецца канчатковы спіс пытанняў, а таксама вызначаецца, якім чынам будзе праходзіць выбарка ўдзельнікаў анкетавання. Выказаць сваё меркаванне мінчане змогуць ужо пачынаючы з другой паловы студзеня і да канца бягучага года. Анкеты будуць разносіць па паштовых скрынях, для збору адказаў у дамах установяць спецыяльныя урны. Акрамя таго, адказаць на пытанні можна будзе і праз інтэрнэт: анкету размесцяць на сайтах раённых ЖКГ, запоўненую форму можна будзе адправіць па электроннай пошце.**

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Аляксей ГЕРАСІМЧЫК**, галоўная мэта анкетавання — практычная. У планах — не проста правесці сацыялагічнае даследаванне і даведацца меркаванне жыхароў горада па тых ці іншых пытаннях, а выкарыстаць атрыманыя звесткі для паляпшэння работы галіны ў цэлым і вырашэння канкрэтных праблем у прыватнасці. Падобныя апытанні праходзяць у сталіцы не ўпершыню, аднак раней іх вынікі дазвалялі ацаніць сітуацыю ў мікрараёне, а гэта 2—3 розныя ЖЭУ. Цяпер жа павінна быць атрымана больш пашыраная інфармацыя — у тым ліку і аб прадметах павышанай увагі жыхароў асобных дамоў.

Пакуль вызначана, што ў анкеце будзе 9 пытанняў, накіраваных на ацэнку задаволенасці насельніцтва аказаннем жыллёва-камунальных паслуг. Напрыклад: як змянілася якасць паслуг за мінулы год? Ці звярталіся вы ў спецыялізаваныя арганізацыі (кантакт-цэнтр ЖКГ, гарадская аварыйная служба, разлікова-даведачны цэнтр) на працягу апошніх 3 месяцаў? Калі так, то як вы можаце ацаніць якасць аказанай вам дапамогі? Пад кожным пытаннем некалькі варыянтаў адказу, якія ўключаюць палярныя меркаванні.

Асаблівая ўвага будзе нададзена тэме, звязанай з асабістай гатоўнасцю жыхароў прымаць удзел у добраўпарадкаванні тэрыторый, напрыклад рамонце пад'ездаў або правядзенні суботнікаў. Гэта дасць магчымасць па-новаму пабудаваць узаемадзеянне службаў ЖКГ і мінчан.

Хутчэй за ўсё, выбарка будзе праводзіцца па серыі дамоў, напрыклад 5-, 9- і 12-павярхоўках розных гадоў па ўсіх раёнах сталіцы. На гэты момант у Мінску больш за 800 тысяч асабовых рахункаў, па кожным з якіх праводзіць анкетаванне сэнсу не мае. Калі такое маштабнае даследаванне пройдзе паспяхова, то верагодна, што яно стане перыядычным. Прыняць удзел у апытанні можна ананімна, дастаткова пазначыць нумар дома.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

АБМЯРКУЕМ

# УТРЫМАНЦАЎ СТАНЕ МЕНШ?

**Згодна са зменамі ў Дэкрэце №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», дэпутаты мясцовых Саветаў могуць цяпер вызваляць грамадзян ад выплаты збору, калі тыя знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Наш карэспандэнт высветліў, як старшыні Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню ставяцца да гэтых змен.**

— У гэтым годзе да нас ужо звярталіся тыя, хто займаецца гаспадаркай, дапамагае бацькам апрацоўваць зямлю, — расказвае **старшыня Галубіцкага сельскага Савета дэпутатаў Глыбоцкага раёна Пётр СУПРАНЁНАК**. — Бываюць і цяжкія сітуацыі, напрыклад калі чалавек звольніўся, але не змог знайсці новую работу па спецыяльнасці. Папраўка была неабходная, каб абараніць добрапрыстойных грамадзян. А тыя, хто не працуе свядома, — няхай плацяць збор.

А **старшыня Вяліканямкоўскага сельскага Савета дэпутатаў Веткаўскага раёна Уладзімір СОНІЧ** гаворыць, што ў іх такіх зваротаў не было. «Лісты шчасця» атрымалі адзінкі: тыя, хто сапраўды не працаваў, або тыя, хто атрымліваў даход не ў нашай краіне. «Папраўку варта было ўводзіць, але сама па сабе яна не вельмі істотная. Трэба найперш вырашаць праблему з працаўладкаваннем. Ёсць людзі, якія хочуць працаваць, а няма дзе. Гэта першапрычына. Я думаю, гэты дэкрэт будзе яшчэ дапрацоўвацца», — гаворыць старшыня Савета.

Згодны з ім і **Аляксандр МЯКІНКА, старшыня Ракаўскага сельскага Савета дэпутатаў Валожынскага раёна**. Ён таксама адзначыў, што дэкрэт можна дапрацоўваць, каб зрабіць больш дасканалай сістэму, каго вызваляць, а каго не. Нават з ільготамі, якія зараз атрымалі непрацуючыя, можа быць не ўсё так проста.

> Папраўку варта было ўводзіць, але сама па сабе яна не вельмі істотная. Трэба найперш вырашаць праблему з працаўладкаваннем. Ёсць людзі, якія хочуць працаваць, а няма дзе.

Каб справядліва налічыць збор, трэба, каб была даведка. **Старшыня Вайковіцкага сельскага Савета Навагрудскага раёна Святлана МАКАР** гаворыць, што да яе ўжо звярталіся грамадзяне з просьбамі пазбавіць іх ад падатку. Раней сельвыканкам выдаваў даведкі ў адвольнай форме, з гэтага года — стандартныя. У іх прапісвалася, колькі зямлі ва ўласнасці, якая падсобная гаспадарка. Даведка выдаецца на главу сям'і з азначэннем, колькі людзей былі прапісаны ў гэты перыяд. «Быў адзін выпадак — чалавек працаваў на сезонных работах качагарам, зарплата маленькая, — неяк трапіў у лік тых, каму налічылі збор. Прынёс даведку з працы — мы яго вызвалілі ад збору. Так пытанні і вырашаем».

А ў Верамейскім сельсавеце ўсталявалася практыка, што па даведкі аб вызваленні ад збору ідуць у райвыканкам. **Старшыня Верамейскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна Ірына КРЫКСІНА** гаворыць, што да іх звычайна звяртаюцца па кансультацыю і даведкі аб зямельных участках. Яны, у сваю чаргу, раяць, як зрабіць у кожнай асобнай сітуацыі.

**Таццяна ШЧАРБАЦЭВІЧ, старшыня Крошынскага сельскага Савета Баранавіцкага раёна**, адзначае, што тыя, хто не хоча працаваць, звычайна са скаргамі не звяртаюцца. Бываюць розныя сітуацыі: у каго інваліднасць, хто бацькоў дагледзае. «Я сачу за прэсай, як разглядаюцца жыццёвыя выпадкі, звязаныя з гэтым зборам. У нас спачатку, калі ўбачылі гэты падатак, было шмат зваротаў — мы тлумачылі, што да чаго. Але скаргаў і канфліктаў не ўзнікала. Трэба сказаць, што праца на зямлі, вядзенне сваёй гаспадаркі — гэта таксама цяжка: трэба карміць і сябе, і сям'ю».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*